Нэлі РАДЗЬКО

#КОНКУРС

***Упершыню ў Наваполацку прайшла адкрытая рэгіянальная выстава-конкурс дзіцячай мастацкай творчасці «Музыка вачыма мастака».***



***Арганізатары і прызёры конкурсу***

З ідэяй правесці творчае спаборніцтва выступіў Наваполацкі дзяржаўны музычны каледж. Ініцыятыву падтрымала Дзіцячая мастацкая школа імя І.Ф. Хруцкага. На першы этап паступіла 45 работ ад 44 навучэнцаў устаноў культуры Полацка і Полацкага раёна, Расонаў, Обаля, Гарадка, Дуброўна, Ушачаў, Шаркаўшчыны і, вядома, Нафтаграда. Кожная карціна праходзіла пільны аналіз прафесійнага журы пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры «Архітэктура і дызайн» Полацкага дзяржуніверсітэта імя Еўфрасініі Полацкай Алены Крамнёвай. Работы ацэньваліся па такіх крытэрыях, як тэхніка выканання, адпаведнасць дадзенай тэматыке, вобразнасць, непасрэднасць, каляровае рашэнне. У другі этап прайшло 17 канкурсантаў. Гран-пры заваявала новапалачанка Юлія Петухова (ДМШ імя І.Ф. Хруцкага) з творам «Беларускі музыка». У якасці прыза выхаванка Ірыны Вялюга атрымала прафесійны набор фарбаў.

Першае месца ў другой узроставай катэгорыі (9-11 гадоў) таксама дасталася вучаніцы Ірыны Уладзіміраўны – Ксеніі Каваленка. Яшчэ адзін прадстаўнік нашай мастацкай школы Ягор Кавалёў узяў другое месца сярод удзельнікаў чацвёртай групы (15-17 гадоў). Яго падрыхтоўкай займалася Вольга Станкевіч.

Прызёры атрымалі неабходныя матэрыялы для стварэння творчых работ, сертыфікаты і салодкія прызы. Урачыстае ўзнагароджванне прайшло ў Дзіцячай мастацкай школе імя І.Ф. Хруцкага. Лепшыя творы прадстаўлены на выніковай выставе, убачыць якую можна да канца верасня.

Арганізатары плануюць праводзіць творчае спаборніцтва штогод.